**Суравец, К.** Пра што немагчыма забыць / К. Суравец // Міёрскія навіны. — 2013. — 12 лют. — С. 2.

**ПРА ШТО НЕМАГЧЫМА ЗАБЫЦЬ**



*Дата 15 лютага для Валерыя Васільевіча Тычко асаблівая. Кожны год у гэты дзень разам з іншымі воінамі-інтэрнацыяналістамі ён прыходзіць на мітынг да помніка «Чорныя цюльпаны», ушаноўвае хвілінай маўчання памяць загінулых на афганскай вайне землякоў і тых, чыё жыццё абарвалася ў мірны час. І не мае значэння, што ўсе яны служылі ў розных войсках, розных падраздзяленнях. Аб'ядноўваюць былых салдат падзеі той вайны, якія калісьці давялося перажыць кожнаму з іх і якія і цяпер яскрава паўстаюць ва ўспамінах, а часам прыходзяць у снах.*

Валерый Тычко трапіў у Афганістан у 1985 годзе. Там прайшлі два гады вайсковай службы.

– Спачатку былі тры месяцы вучэбкі ў горадзе Фергана, што ва Узбекістане, – расказвае субяседнік, – а потым адразу Афганістан. У батальёне я быў адзін беларус. З Расіі хлопцы служылі, чачэнцаў шмат. Нашым узводам у 25 чалавек таксама чачэнец камандаваў. Аднак адносіны ў нас добрыя былі, сяброўскія.

Жылі салдаты ў ваенных палатках. На тэрыторыі часці знаходзіліся сталовая, лазня, шпіталь. Асноўнай задачай воінаў была разведка.

Прайшлі гады службы, назаўсёды пакінуўшы ў памяці імёны саслужыўцаў і падзеі тых дзён. Пасля дэмабілізацыі Валерый Васільевіч вырашыў вучыцца. Хацеў пастуііць у віцебскі педінстытут, каб потым працаваць настаўнікам фізкультуры. Але падаваць дакументы ў ВНУ ўжо было позна, таму пайшоў у вучылішча, дзе атрымаў спецыяльнасць зваршчыка.

Аднак свае педагагічныя планы ўсё ж часткова рэалізаваў. Калі працаваў у Верхнядзвінску, быў частым госцем у школе. Там дзейнічаў патрыятычны клуб, і воін-інтэрнацыяналіст прымаў актыўны ўдзел у яго рабоце.

Прычынай змяніць месца жыхарства і вярнуцца на Міёршчыну сталі асабістыя абставіны. З'явілася ўласная сям'я, у якой падрастала двое дзяцей. Цяпер сын Артур працуе лабарантам у СШ № 1, а дачка Іна вучыцца ні другім курсе Полацкага дзяржуніверсітэта, яна будзе геадэзістам. Сам Валерый Васільевіч працуе зваршчыкам ва УП ЖКГ.

Падтрымлівае ён адносіны са сваімі саслужыўцамі.

– Пасля дэмабілізацыі перапісваўся з хлопцамі. Цяпер стараюся знаходзіць іх праз сацыяльныя сеткі ў інтэрнэце. А вось пра тое, што сусед па лесвічнай пляцоўцы Ігар Байкоў служыў са мной у адной брыгадзе, даведаўся ўжо ў мірны час. Высветлілася гэта падчас адной з размоў. Батальёны былі розныя, таму ў Афгане мы і не сустрэліся, а вось зараз жывём побач.

Валерыю Васільевічу не трэба прыкладваць намаганні, называючы праз гады імёны баявых таварышаў. Яны запісаны ў памяці назаўсёды, і сцерці іх непадуладна часу.

**Кацярына СУРАВЕЦ**